Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 6 (219)
Панядзелак
28
сакавіка
1955 г.

Цана 20 кап.

КУЛЬТУРА СТУДЭНТА

Плённая і радасная праца на карысць Радзімы чакае нашых студэнтаў пасля заканчэння універсітэта. Яны панясуць у масы не толькі апошняе слова навукі, але і высокую духоўную культуру і маральную чысціню. З дыпломамі педагогаў, юрыстаў, журналістаў, геолагаў сённяшнія студэнты ўступяць у самастойнае жыццё, будуць весці паўсядзённую барацьбу за комуністычнае выхаванне совецкіх людзей.

Паспяхова фарміраваць светапогляд юнацтва, змагацца супроць антыграмадскіх учынкаў і з'яў можа чалавек, які, будучы добра адукаваным, з'явіцца адначасова носьбітам высокіх маральных якасцей. Прывіваць сабе гэтыя якасці студэнт павінен штодзённа і настойліва. Высокае маральнае аблічча нашага студэнта праяўляецца не толькі ва ўменні добра апранацца, не ў паказной ветлівасці ў абыходжанні. Яно праяўляецца перш за ўсё ў адносінах да калектыву, у духоўным жыцці чалавека.

Пераважная большасць студэнтаў універсітэта вядзе сябе культурна, вызначаецца сціпласцю. Але асобныя [illegible]арышы не прыкмячаюць за сабой [illegible]аторых адмоўных дробязей, якія [illegible]канчатковым ліку і вызначаюць іх маральнае аблічча, уплываюць на іх адносіны да калектыву.

Вось зайшоў студэнт у будынак універсітэта і, не знімаючы галаўнога ўбора, з папяросай у зубах, ідзе далей па калідорах. Здаецца, ну што-ж тут такога! Але вось у педінстытуце гэта лічаць недапушчальнай справай, ніхто са студэнтаў або выкладчыкаў не ходзіць па калідорах і аўдыторыях у галаўным уборы, не курыць. У педінстытуце добра разумеюць, што культура студэнта павінна адчувацца ва ўсім, нават у гэтых «дробязях», што аб павазе студэнтаў да сваёй навучальнай установы трэба меркаваць таксама і па таму, ці зняў ён шапку, уваходзячы ў памяшканне. Ва універсітэце-ж курэнне ў калідорах лічыцца звычайнай з'явай, а нашы гаспадарнікі нават паставілі урны па кутках калідораў для акуркаў. Тут ходзяць студэнты ў галаўных уборах, і ніхто на гэтыя парушэнні не рэагуе.

Часта такія «дробязі», калі на іх своечасова не звярнуць увагі, ператвараюцца ў больш непрыемныя справы. Напрыклад, не робяцца заўвагі студэнтам за беганіну па калідорах, за курэнне. Падбадзёраны неўмяшаннем у свае дзеянні, такі студэнт можа назаўтра прыйсці п'яным, аблаяць таварыша, учыніць бойку і г. д. А калі яго потым за сур'ёзныя праступкі патрэбна будзе выключыць з універсітэта, усе будуць разводзіць рукамі: як гэта здарылася? Быў, здаецца, добры студэнт, а зараз ганьбіць увесь калектыў, і ніхто не ўспомніць аб тым, што ўсё пачалося з нейкіх «дробязей».

Толькі таму, што калектыў іншы раз не жадае пакрыўдзіць таварыша за яго, на першы погляд, нязначны праступак, у нас ёсць выпадкі бурсацкіх паводзін, пагардлівых адносін да элементарных норм маралі. Яны маюць месца на ўсіх факультэтах, але асабліва трывожнае становішча склалася на юрыдычным факультэце. Рад студэнтаў не толькі адкрыта парушае вучэбную дысцыпліну, але вядзе сябе амаральна, учыняе дэбошы ў інтэрнатах, хуліганіць у горадзе. Гэта сведчыць аб дрэннай выхаваўчай рабоце на факультэце і павінна выклікаць адпаведнае рэагаванне грамадскіх арганізацый універсітэта.

Аб нізкай культуры паводзін сведчаць і выпадкі зазнайства, пагоня за крыклівымі модамі, стыльным адзеннем. Часта па калідорах біялагічнага корпуса прахаджваецца студэнт I курса філалагічнага факультэта О. Шабельскі. У яго па самыя плечы валасы, на ім шчыльна прылягаючыя да цела трыкатажныя штаны і ледзь не цыркавая кофта. Вядома, гэты студэнт мае ўсе магчымасці набыць чалавечае адзенне. Аднак нікім не спыненае імкненне да стылю робіць няскромнага студэнта пасмешышчам факультэта.

На IV курсе біёлага-глебавага факультэта вучацца студэнткі Ніна Харытонава і Ада Дзянісава. У пагоні за стыльным адзеннем яны забываюць аб элементарнай скромнасці, стаяць у баку ад калектыву, з пагардай адносяцца да таварышаў. Хто ведае, ці не будуць яны ў будучым весці сябе яшчэ горш, калі курс цяпер па-сапраўднаму не возьмецца за іх перавыхаванне?

Есць яшчэ ў нас нямала крыкліва апранутых студэнтак, з завушніцамі, з ярка чырвоным манікюрам; яны доўгія часы праводзяць за ўкладкай валос. Дзе тут да вучобы, да ўдзелу ў жыцці калектыву, калі яны ледзь паспяваюць сачыць за сваім знешнім выглядам. Тут выбар не складаны—або вучыся, або выседжвай гадзіны ў цырульні; выкарыстоўвай частку стыпендыі на кнігі або бегай па мінскаму «таўчку» і шукай якую-небудзь «незвычайную» сукенку ці гальштук невераемных расфарбовак.

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што на пытанні культуры студэнтаў у нас яшчэ звяртаецца мала ўвагі, што грамадскія арганізацыі, выкладчыкі далёка недастаткова займаюцца пытаннямі выхавання студэнтаў у духу комуністычнай маралі. Камітэт комсамола, прафком, вучэбная частка самаўхіляюцца ад гэтай сур'ёзнай справы, адносяцца да яе фармальна.

Неабходна сур'ёзна паляпшаць культурна-выхаваўчую работу на факультэтах, выяўляць і ліквідаваць прычыны некультурных паводзін. Абавязак кожнага студэнта—стрымліваць парушальнікаў дысцыпліны, дабівацца таго, каб фактаў амаральных учынкаў у нас не было.

СОТЫ НУМАР ГАЗЕТЫ „Слова філолага"

Вышаў соты нумар насценнай газеты «Слова філолага» (рэдактар т. Захарава). Адна з лепшых ва універсітэце, газета з'яўляецца дзейсным памочнікам партыйнай, комсамольскай і прафсаюзнай арганізацый філалагічнага факультэта, моцным сродкам комуністычнага выхавання студэнтаў.

У цэнтры ўвагі газеты—вучоба студэнтаў. Працаваць сістэматычна, настойліва вывучаць асновы перадавой совецкай навукі заклікае яна ў сваіх нумарах.

На сваіх старонках газета ўзнімае пытанні навуковай і культурна-масавай дзейнасці студэнтаў, разгортвання мастацкай самадзейнасці і фізкультурнай работы на факультэце. Пастаянным стаў у газеце аддзел фельетона.

Старанна рыхтуемыя і добра, з мастацкім густам афармляемыя нумары газеты атрымоўваюцца змястоўнымі і цікавымі.

Вітаем газету філалагічнага факультэта з выхадам сотага нумару і жадаем яе рэдкалегіі далейшых поспехаў у справе комуністычнага выхавання нашых студэнтаў.

Па універсітэту

ЭКСКУРСІЯ У КАРЦІННУЮ ГАЛЕРЭЮ

Група студэнтаў філалагічнага факультэта наведала выстаўку-перасоўку Эрмітажа, якая размешчана ў памяшканні карціннай галерэі.

Студэнты пазнаёміліся з заходнееўрапейскім жывапісам XV—XIX стагоддзяў, у прыватнасці, з жывапісам Францыі, Іспаніі, Германіі і іншых краін.

Асабліва ўдзельнікам экскурсіі спадабаліся партрэты Мусінай-Пушкінай (мастак Франсуа Есавье Вінтэрхальтэр), Полаўцэвай (мастак Эміль Огюст Карлюс Дюран), партрэт старухі (мастак Рэмбрант), жаночы партрэт XVI стагоддзя (мастак Рубенс).

Экскурсія прынесла студэнтам шмат карысці.

Л. БОНДАР.

ДАКЛАД АБ ТВОРЧАСЦІ В. В. МАЯКОЎСКАГА

Нядаўна на II курсе фізіка-матэматычнага факультэта студэнтка аддзялення журналістыкі Л. Краснеўская прачытала даклад «Владзімір Владзіміравіч Маякоўскі і совецкая моладзь». Яна расказала аб жыцці і дзейнасці В. В. Маякоўскага, аб ідэйнай сіле яго творчасці, аб барацьбе паэта за сапраўднага совецкага чалавека.

Пасля даклада выступіла дацэнт А. Н. Нахімоўская, якая асабіста бачыла Маякоўскага ў час яго выступленняў у Мінску.

С. СКАКУН.

ПАСЯДЖЭННЕ ГУРТКА ЖУРНАЛІСТЫКІ

На днях ва універсітэце адбылося пасяджэнне гуртка журналістыкі. З дакладам «Публіцыстыка І. Эрэнбурга ў пасляваенныя гады» выступіла студэнтка I курса Л. Гнедзіна. А. Мальдзіс і Е. Крыскавец унеслі рад заўваг у адрас дакладчыка.

Пасля даклада адбылося абмеркаванне альманаха «Творчасць журналіста» № 7, які выпускаецца гурткоўцамі.

Студэнт Адамчык зрабіў агляд вершаў, змешчаных ў альманаху; І. Хаўратовіч—аналіз крытычных матэрыялаў; Е. Крыскавец даў кароткую характарыстыку прозы.

З заключным словам выступіла выкладчык Т. Бондарава. Яна ўказала на недахопы альманаха і выказала ўпэўненасць, што чарговы нумар будзе значна лепшым.

Да новых поспехаў

З 19 сакавіка па 3 красавіка ва універсітэце праводзіцца агляд мастацкай самадзейнасці. У аглядзе ўдзельнічае больш 500 студэнтаў. Факультэты падрыхтавалі новыя, больш пашыраныя праграмы выступленняў.

Палепшыў сваю работу калектыў мастацкай самадзейнасці геолага-геаграфічнага факультэта. Драматычны гурток факультэта пакажа на аглядзе дзве п'есы, танцавальны выканае сем танцаў. Струнны гурток падрыхтаваў пяць новых нумароў.

Не менш багатыя праграмы прадаставілі фізіка - матэматычны, філалагічны і іншыя факультэты.

Пашырылі свой рэпертуар і агульнаўніверсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці: драматычны, вакальны і струнны. Перабудаваў работу танцавальны калектыў, які падрыхтаваў да агляду шэраг цікавых нумароў.

Грамадскім арганізацыям універсітэта неабходна забяспечыць спрыяючыя ўмовы для правядзення агляду, дапамагчы ў набыцці недастаючых касцюмаў і музычных інструментаў з тым, каб агляд мастацкай самадзейнасці ператварыўся ў сапраўднае свята песні і танца нашых студэнтаў.

Я. РАПАЦЭВІЧ

УНІВЕРСІТЭТ—СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Адбыўся агульны сход партыйнай арганізацыі універсітэта, на якім комуністы заслухалі даклад Міністра сельскай гаспадаркі БССР тав. Касцюка «Рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі БДУ імя В. І. Леніна».

Выступіўшыя ў спрэчках комуністы адзначылі вялікае значэнне рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС ў справе мабілізацыі совецкага народа на выкананне грандыёзных задач ўздыму сельскай гаспадаркі.

Комуніст тав. Андрушчанка ў сваім выступленні расказаў аб тым, што студэнты і аспіранты біёлага-глебавага факультэта прарабілі значную даследчую работу па вывучэнню лугоў Маладзечанскай вобласці, правялі вопыты па вырошчванню кукурузы ва ўмовах Мінскай вобласці.

— Неабходна павысіць патрабаванні да кафедраў,—сказаў у заключэнне тав. Андрушчанка,—якія маюць ўсе магчымасці займацца даследчай работай, накіраванай у дапамогу сельскай гаспадарцы.

— Студзеньскі Пленум ЦК КПСС,— сказаў прафесар тав. Паўлючэнка,— паставіў задачу: шляхам павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур штогод атрымоўваць 10 мільярдаў пудоў хлеба. Для паспяховага вырашэння гэтай задачы неабходна павялічыць вытворчасць мінеральных угнаенняў. У гэтых адносінах Беларуская ССР мае вялікія магчымасці. Тым не менш, наша рэспубліка да апошняга часу ўвозіць мінеральныя ўгнаенні з другіх раёнаў краіны. У гэтым вялікая віна ўскладаецца на наш універсітэт, Акадэмію навук БССР, яе навукова-даследчыя інстытуты і іншыя адпаведныя арганізацыі, якія слаба займаюцца вырашэннем праблемы вытворчасці мясцовых угнаенняў.

Тав. Паўлючэнка далей указаў, што, як паказваюць вопыты, унясенне ў глебу мікраэлементаў садзейнічае павышэнню не толькі ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, але і паляпшае якасць спажыўных вяшчэстваў траў, што становіцца ўплывае на прадуктыўнасць жывёлагадоўлі. Аднак, каб рацыянальна выкарыстаць мікраэлементы, неабходна вывучыць якасць глебы, а для гэтага патрэбна скласці глебавую карту. Сваімі ўласнымі сіламі універсітэт здольны скласці такую карту для некалькіх калгасаў. Для выканання гэтай работы ў маштабе рэспублікі нам неабходна дапамога адпаведных арганізацый і, перш за ўсё, Міністэрства сельскай гаспадаркі.

Выступіўшыя на сходзе тт. Навеццеў і Ігнаценка заклікалі вучоных-спецыялістаў універсітэта актыўна ўключыцца ў работу па аказанню канкрэтнай навуковай дапамогі работнікам сельскай гаспадаркі ў выкананні пастаўленых партыяй задач—рэзкаму павелічэнню вытворчасці зерня і павышэнню прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

У сваёй пастанове партыйны сход адобрыў рашэнні студзеньскага Пленума ЦК КПСС і намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на актыўны ўдзел калектыву нашага універсітэта ў справе ўздыму сельскай гаспадаркі краіны.

Вышэй узровень комсамольскай работы!

Падрыхтоўка ўсебакова развітых, высокакваліфікаваных спецыялістаў для патрэб нашай народнай гаспадаркі—асноўная задача, на ажыццяўленне якой павінна быць накіравана ўся работа комсамольскіх арганізацый факультэтаў пры ўмове правільнага і паўсядзённага кіраўніцтва дзейнасцю комсамола з боку партыйных арганізацый. Работа комсамольскіх арганізацый, як правіла, стаіць на высокім узроўні там, дзе партыйныя арганізацыі клапатліва дапамагаюць ім у іх практычных справах.

Важнасць гэтай задачы зразумела партыйная арганізацыя хімічнага факультэта. На працягу першага семестра пытанні аб комсамольскай рабоце неаднаразова абмяркоўваліся на партыйным бюро факультэта; значную практычную дапамогу ў рабоце комсамольскай арганізацыі аказваюць члены партыйнага бюро і яго сакратар т. Паўлючэнка.

Нядаўна ў партарганізацыі адбыўся адкрыты партыйны сход, на якім комуністы заслухалі справаздачу сакратара бюро ЛКСМБ хімфака т. Марчанка аб рабоце комсамольскай арганізацыі ў першым семестры.

У сваім рашэнні партыйны сход адзначыў, што за прайшоўшы перыяд комсамольская арганізацыя факультэта правяла рад мерапрыемстваў у галіне вучэбна-выхаваўчай і ідэйна-выхаваўчай работы. Асноўную ўвагу комсамольская арганізацыя ўдзяляла павышэнню паспяховасці студэнтаў, паляпшэнню якасці іх ведаў. Комсамольская арганізацыя дабілася ў гэтым несумненных поспехаў, аб чым красамоўна гавораць вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі. Студэнты-комсамольцы на экзаменах паказалі трывалыя веды, уменне паслядоўна і навукова правільна выкладаць адказы на пастаўленыя пытанні.

Значных вынікаў дасягнула комсамольская арганізацыя ў правядзенні палітыка-выхаваўчай работы. У групах рэгулярна праводзяцца палітінфармацыі па пытаннях унутранага і знешняга становішча СССР, арганізуюцца культпаходы ў кіно, тэатры, вечары мастацкай самадзейнасці; вялікая група комсамольцаў-агітатараў праводзіць агітацыйна-масавую работу сярод рабочых аўтазавода.

Аднак, як указаў у сваім рашэнні партыйны сход, гэтыя поспехі не павінны засланяць істотных недахопаў у рабоце комсамольскай арганізацыі. Комсамольцы хімічнага факультэта не змаглі яшчэ да гэтага часу арганізаваць сваю дзейнасць у адпаведнасці з рашэннямі XII з'езда ВЛКСМ і XVIII з'езда ЛКСМБ. Бюро ЛКСМБ факультэта не сістэматычна вядзе барацьбу за глыбокія і трывалыя веды студэнтаў, рэдка заслухоўвае на сваіх пасяджэннях пытанні, звязаныя з павышэннем паспяховасці і дысцыпліны комсамольцаў, з паляпшэннем якасці падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў. Комсамольскае бюро недастаткова цесна ўвязвае палітыка-выхаваўчыя і культурна-масавыя мерапрыемствы з вучэбнай работай. Члены бюро і яго сакратар т. Марчанка слаба ўцягваюць студэнтаў ў навукова-даследчыя гурткі. Работа гурткоў ні разу не абмяркоўвалася на комсамольскім бюро факультэта. Не дзіўна, што на факультэце марудна разгортваецца падрыхтоўка да агляду студэнцкіх навуковых работ.

Істотным недахопам у комсамольскай рабоце з'яўляецца тое, што крытыка з боку некаторых комсамольцаў на сходах не прымаецца членамі комсамольскага бюро як кіраўніцтва да дзеяння. Комсамольскія сходы і пасяджэнні бюро падчас праходзяць неарганізавана, нытанні, якія намячаецца разабраць, рыхтуюцца наспех і нярэдка носяць інфармацыйны характар. У запушчаным стане знаходзіцца комсамольская гаспадарка, неахайна афармляюцца пратаколы.

Выступіўшыя ў спрэчках комуністы і комсамольцы адзначылі слабы кантроль комсамольскага бюро за выкананнем прынятых рашэнняў, а таксама за работай нізавых комсамольскіх арганізацый.

— Комсамольскае бюро факультэта,—адзначыла ў сваім выступленні т. Васільева,—адарвалася ад комсамольскіх груп, члены яго рэдка бываюць там і не аказваюць неабходнай дапамогі групоргам у іх рабоце.

Комсамольскія сходы факультэта праводзяцца вельмі рэдка. На працягу першага семестра быў праведзен усяго толькі адзін сход. Такая няправільная практыка прыводзіць да застою комсамольскага жыцця на факультэце, да адрыву кіраўніцтва бюро ад асноўнай масы комсамольцаў.

Выступаючыя адзначылі таксама, што комсамольцы часта парушаюць дысцыпліну. Гэта яскрава бачна не толькі ў сістэматычных пропусках асобнымі студэнтамі заняткаў, але і ў слабай падрыхтоўцы да семінараў. Праяўленні недысцыплінаванасці з боку некаторых комсамольцаў выражаюцца і ў іх грубых адносінах да выкладчыкаў, аб чым комсамольскаму бюро нават не было вядома. Натуральна, што бюро не магло заклікаць грубіянаў да парадку.

Комсамольскае бюро аслабіла кіраўніцтва насценным друкам. Факультэцкая і групавыя газеты выходзяць нерэгулярна. Знізілася якасць іх артыкулаў; рэдка паяўляюцца на іх старонках крытычныя матэрыялы.

Комуністы і комсамольцы рэзка крытыкавалі камітэт ЛКСМБ універсітэта за яго дрэннае кіраўніцтва работай факультэцкіх комсамольскіх арганізацый. Камітэт комсамола адарваўся ад факультэтаў, жывую практычную справу падмяніў агульнымі ўказаннямі і разважаннямі аб неабходнасці паляпшэння работы. У сваёй рабоце камітэт ЛКСМБ павінен абапірацца не на вузкі круг людзей, а на ўвесь актыў факультэтаў, на ўсю масу комсамольцаў. Члены камітэта комсамола павінны трымаць цесную сувязь з комсамольцамі, ведаць іх жыццё, цікавіцца іх запатрабаваннямі.

Комсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта неабходна ажывіць сваю работу, поўнасцю перабудаваць яе ў адпаведнасці з рашэннямі XII з'езда ВЛКСМ і XVIII з'езда ЛКСМБ. Уся дзейнасць комсамольскай арганізацыі павінна быць накіравана на выкананне рашэння, прынятага партыйным сходам факультэта.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Патрэбен хімічны кабінет

Аб хімічным кабінеце гавораць больш двух год у рэктарате, на Вучоных советах. Але да гэтага часу далей размоў і абяцанняў справа не пасунулася. І зараз, як і два гады назад, факультэт не мае свайго кабінета.

Калі студэнту патрэбна падрыхтаваць даклад, напісаць навуковую работу ці падрабязней азнаёміцца з зацікавіўшай яго тэмай, ён сустракаецца з вялікімі цяжкасцямі. Даводзіцца часамі стаяць у бібліятэцы ў чарзе, таму што неабходная кніга бывае на руках або знаходзіцца ў кнігасховішчы.

Яшчэ складаней пытанне з даведачнай літаратурай. Многіх, крайне неабходных хімічных даведнікаў ва універсітэце пакуль што няма зусім. Ну, а тыя, якія ёсць, маюцца толькі ў адным экземпляры. У выніку кафедры хімфака не маюць магчымасці прывучаць студэнтаў да штодзённага карыстання гэтымі даведнікамі. Недастатковае ўменне карыстацца даведнікамі нашы студэнты асабліва востра адчуваюць пры праходжанні вытворчай практыкі і пры напісанні дыпломных работ.

Усё гэта значна тармозіць паспяховую работу студэнтаў. Але ўсяго гэтага можна пазбегнуць, калі факультэт будзе мець свой кабінет. У ім можна будзе сканцэнтраваць асноўны кніжны фонд па спецыяльнасці, стварыць падрабязную картатэку кніг і часопісных артыкулаў, знаёміць студэнтаў з навінкамі навуковай літаратуры і, самае галоўнае, тут можна будзе заўсёды плённа працаваць, маючы пад рукамі ўсё неабходнае.

У нас ва універсітэце ўсе факультэты і нават асобныя кафедры маюць кабінеты. Даўно пара стварыць кабінет і для хімічнага факультэта.

А. БАРАНАВА,
дацэнт кафедры неарганічнай хіміі,
В. ШЛЫК,
асістэнт,
Т. БАЛЬШОВА,
асістэнт,
К. ПЯЧЭРСКАЯ,
дацэнт кафедры арганічнай хіміі
В. ЦІКА[illegible]
старшыня СНТ хімічнага [illegible]

Міма галоўнага

Выйшаў чарговы нумар насценнай газеты фізіка-матэматычнага факультэта. Калі ўлічваць перыядычнасць выхаду газеты—раз у два тыдні—то гэта павінен быў-бы быць не сёмы нумар, а пятнаццаты.

Выхад газеты толькі да юбілейных дат, як гэта практыкуецца на факультэце, немінуча прымушае яе плесціся ў хвасце падзей.

Аб лепшых студэнтках і аспірантках напісаны тры замалёўкі, якія амаль нічым не адрозніваюцца адна ад другой. Усе яны пачынаюцца шаблоннымі словамі, маюць аднолькавы канец. Ва ўсіх замалёўках аднолькавыя эпітэты: «скромная, отличный товарищ» і г. д. Усё гэта, пазбаўленае фактаў, зводзіць на нішто цікавасць да матэрыялаў і, як казаў М. І. Калінін, прывучае чытача думаць гатовай фразай ці зусім не думаць над зместам.

Бясспрэчна, што ў цэнтры ўвагі газеты павінны стаяць пытанні вучобы. Але ў разглядаемым нумары на гэтую тэму ёсць толькі адзін невялікі матэрыял—«С первых дней за учёбу». Гэта нешта накшталт закліку да вучобы. Прозвішчы добрых студэнтаў названы, дрэнных—не. Заметка напісана без дастатковых фактаў, крытыка ў ёй агульная.

Такі-ж недахоп і крытычнага выступлення «Навстречу смотру художественной самодеятельности». Выступленне заканчваецца пажаданнем тым, па чыёй віне дрэнна вядзецца падрыхтоўка да агляду самадзейнасці, хутчэй наладзіць работу.

Нецікавасць, абстрактнасць крытычных выступленняў, абыякавыя адносіны да вучобы, якой адводзіцца ў нумары не больш $^1/_7$ месца,—усё гэта сведчыць аб слабой рабоце рэдкалегіі газеты «За навуку» (рэдактар т. Жбанкоў).

НЕ ЗАСПАКОЙВАЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

★

І. ІГНАЦЕНКА,
сакратар партыйнай арганізацыі універсітэта

★

За час мінулай выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных партыйная арганізацыя універсітэта многае зрабіла па паляпшэнню агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва і пастаноўцы ідэйнага выхавання студэнтаў на больш высокі ўзровень.

Цэнтрам усёй агітацыйна-масавай работы з'явіліся агітпункты. У агітколектывах працавала каля 200 агітатараў. Імі праведзена больш дзевяцісот гутарак, якімі ахоплена больш 4000 выбаршчыкаў. На агітпунктах кожны тыдзень для выбаршчыкаў праводзіліся масавыя мерапрыемствы: чыталіся лекцыі і даклады, дэманстраваліся кінофільмы, ставіліся канцэрты мастацкай самадзейнасці. На працягу ўсяго перыяду выбарчай кампаніі працаваў стол даведак і кансультацый.

Добрасумленна працавала абсалютная большасць агітатараў, з якіх найбольш актыўнымі з'яўляюцца тт. В. Лёшына, Е. Байрашэўская, Скарабагаты, І. Пашына, Ф. Рогаль, Г. Тарайкоўская і многія другія.

Але сярод агітатараў былі і такія, якія безадказна адносіліся да сваіх абавязкаў. Гэта тт. Малінін (гістфак), Душкевіч (аддзяленне журналістыкі), Сцяпанава (філфак), Рэут, Цішановіч (фізмат), Грэкава, Корзун, Стругач (геолага-геаграфічны факультэт). Яны не толькі не правялі ніводнай гутаркі з выбаршчыкамі, але не былі ні разу на агітпункце.

Неабходна адзначыць, што партыйная арганізацыя фізмата (сакратар т. Зяцькоў), геолага-геаграфічнага факультэта (сакратар т. Салун), філалагічнага факультэта (сакратар т. Булацкі) недастаткова займаліся пытаннямі падбора і кіраўніцтва работай вылучаных імі агітатараў. Уся справа з іх боку зводзілася толькі да вылучэння агітатараў, пры гэтым не заўсёды падрыхтаваных да гэтай адказнай справы таварышаў.

Многія комуністы нашай партарганізацыі працавалі ў складзе ўчастковых і акруговых выбарчых камісій. Большасць з іх добрасумленна аднеслася да сваіх абавязкаў. Гэта тт. Б. Бярэзін, Ф. Нечай, Л. Шашкоў. Актыўна працавалі загадчык агітпунктам № 1 т. Гарбаленя і кіраўнік агіткалектыва т. Паўленка.

Між тым некаторыя комуністы (тт. Карпік, Захарава, Яравікоў), бачна, не лічылі работу ў выбарчых камісіях важным партыйным абавязкам. Яны, як правіла, спазняліся на дзяжурства, уходзілі з яго раней часу, іншы раз не з'яўляліся на пасяджэнне камісіі.

Трэба таксама адзначыць недастаткова актыўны ўдзел прафкома і асабліва камітэта комсамола ў рабоце па падрыхтоўцы і правядзенню выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Камітэт комсамола (сакратар т. Філімоненка) самаўхіляўся ад гэтай важнай работы. Усе мерапрыемствы праходзілі без актыўнага ўдзелу камітэта. У выбарчай кампаніі працавала многа комсамольцаў, але камітэт зусім не цікавіўся іх работай. Гэта можна растлумачыць тым, што камітэт комсамола, відавочна, не зразумеў важнасці гэтай палітычнай кампаніі, не зразумеў пастановы ЦК ВЛКСМ аб удзеле комсамольскіх арганізацый у выбарчай кампаніі.

Значна больш магла-б зрабіць многатыражная газета «За сталінскія кадры». На старонках газеты мала асвятлялася работа агіткалектыву, выбарчых участковых камісій і зусім не адлюстроўвалася работа партыйнай арганізацыі юрыдычнага факультэта, дзе быў самастойны выбарчы ўчастак.

Увогуле партыйная арганізацыя прарабіла вялікую арганізацыйную і палітычную работу. Вынікам гэтай работы з'явілася арганізаванае правядзенне дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Аднак, пасля выбараў агітацыйна-прапагандысцкая работа сярод працоўных некалькі знізілася. У сувязі з гэтым неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу загадчыкаў агітпунктаў і кіраўнікоў агіткалектываў на актывізацыю работы сярод насельніцтва. Уся агітацыйна-масавая работа сярод насельніцтва павінна быць накіравана на далейшае пашырэнне і ўмацаванне сувязі з масамі, на выхаванне працоўных у духу комуністычнай маралі.

У мэтах умацавання агіткалектыву партыйныя арганізацыі факультэтаў павінны перагледзець склад агітатараў і людзей, якія не апраўдалі давер'я, вызваліць ад гэтай пачэснай работы. Партбюро універсітэта павінна ўдзяліць больш увагі справе правядзення інструктыўных семінараў з агітатарамі, арганізоўваць іх рэгулярна, павысіць іх ідэйна-палітычны ўзровень. Кіраўнікі агітпунктаў з дапамогай камітэта комсамола, прафкома і мясцкома абавязаны ў бліжэйшыя дні абнавіць наглядную агітацыю, прывесці яе ў адпаведнасць з задачамі, пастаўленымі студзеньскім Пленумам ЦК КПСС і II сесіяй Вярхоўнага Совета СССР. Партыйная арганізацыя універсітэта, праводзячы палітычную работу сярод насельніцтва, абавязана прымаць рознастайныя меры да павышэння яго ідэйнага ўзроўню.

Замацаваныя для правядзення агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва агітатары павінны не менш 2—3 разоў у месяц праводзіць па месцу жыхарства працоўных гутаркі, гучныя чыткі газет і часопісаў. Неабходна не менш аднаго разу ў месяц праводзіць на агітпунктах масавыя мерапрыемствы з насельніцтвам былога выбарчага ўчастка.

Наша партарганізацыя — адна з буйнейшых партарганізацый раёна горада. Яна мае ўсё неабходнае, для правядзення палітычнай работы сярод насельніцтва на высокім ідэйна-палітычным узроўні, і яна прыкладзе максімум намаганняў, каб узорна выконваць ускладзеныя на яе задачы.

Аб выхаванасці, працоўнай дысцыпліне

...У аўдыторыі ідзе лекцыя. На апусцеўшаму калідору ў гэты час павольна рухаецца студэнтка і гучна, ва ўвесь голас, спявае. Магчыма, чалавек яна здатны да песень і нядрэнна ведае музыку, але ці можна лічыць яе культурнай? Ёй «напляваць», што ў аўдыторыях напружана працуюць. А можа яна проста не разумее, што перашкаджае гэтай працы?

...Пасля званка калідор апусцеў, але лекцыі яшчэ не пачаліся. Спазніўшыся, студэнтка імкліва бяжыць у сваю аўдыторыю. Нечакана з-за дзвярэй адной з аўдыторый дзябёлы юнак ставіць бягучай падножку. Тая спатыкаецца. Рогат. Праўда, абыйшлося ўсё добра. Дзяўчына не разбіла нос, але што можна думаць аб такім «сяброўскім жарце»?

Малюнкі, прыведзеныя вышэй, мне давялося назіраць у хімічным корпусе універсітэта ў час заняткаў. Яны яскрава сведчаць аб культурароўні некаторых нашых студ[э]нтарыў. Культура чалавека перш [а]рыхтляецца ў яго адносінах [д]а сваёй і другіх людзей), [м]аральводзінах. Грубы жарт гаворыць не толькі аб адсутнасці выхаванасці, але і аб адсутнасці элементарнай культуры.

З культурай непарыўна звязана і працоўная дысцыпліна. На заводзе ці фабрыцы кожны рабочы (за выключэннем, вядома, разгільдзяяў) змагаецца за максімальнае выкарыстанне мінут і секунд свайго рабочага часу. Рабочы добра ўсведамляе, што яго рабочы час належыць краіне і што ад выкарыстання гэтага часу залежыць добрабыт народа. Не меншай свядомасці, здавалася-б, мы павінны чакаць ад студэнтаў, як ад людзей высокай культуры. На жаль, у нас стала звычайнай з'явай, што студэнты пачынаюць рассаджвацца толькі тады, калі лектар ужо ў аўдыторыі. Іншы раз пры гэтым узнікае мітусня і спрэчкі наконт месц, пошукі сшыткаў і кніг, а некаторыя канчаюць пачатую яшчэ ў час перапынку займальную гісторыю. Многа ўходзіць каштоўнага часу, пакуль лектару можна будзе пачаць лекцыю. Ёсць аматары займацца гутаркамі і ў час лекцый. Гэтыя студэнты не лічацца з тым, што перашкаджаюць і сваім таварышам і лектару. Зразумела, супроць іх можна прыняць адпаведныя меры, але справа не ў гэтым,—важна тое, што ў такіх людзей няма працоўнай дысцыпліны, няма пачуцця парадку і адказнасці за свае ўчынкі. А гэтыя якасці выпрацоўваюцца на адпаведнай ступені культурнасці чалавека і служаць паказчыкам гэтай культурнасці. Можа такіх студэнтаў і нямнога, але яны перашкаджаюць усім, з-за іх непрадукцыйна працуюць у аўдыторыі ўсе. Як лектар можа прачытаць на высокім узроўні лекцыю, цікава пабудаваць і выкласці слухачам яе матэрыял, калі яму назойліва лезе ў вушы перашоптванне розных «кумачак»? І чым з большым захапленнем чытаецца лекцыя, тым гучней шушуканне гэтых «кумачак», бо ім лектар таксама «перашкаджае».

Але гэта, так сказаць, «унутраныя перашкоды», а колькі «знешніх», з-за якіх не толькі губляецца час, але і прама немагчыма весці заняткі? Неяк у час лекцыйнага перапынку студэнты III курса геолага-геаграфічнага факультэта надумалі нешта накшталт майн-рыдаўскай вайны. З дзікімі воклічамі яны працягвалі лётаць па калідоры і нават забіраліся на столь у той час, калі ў другіх аўдыторыях ужо пачаліся лекцыі. Мне давялося перапыніць лекцыю і адправіць студэнта іх супакойваць. Аднак і гэта не дапамагло. Прышлося самому ісці спачатку ў калідор, а затым на лесвіцу і прапанаваць «воінам» заключыць «перамір'е». Гэта здараецца, праўда, не так часта, але вось звычайная з'ява: чытаеш лекцыю і раптам адчыняюцца дзверы. Зірне нейчая галава і схаваецца; праз некаторы час усё паўтараецца такім-жа чынам. За адну двухгадзінную лекцыю я аднойчы такіх зазіранняў налічыў больш адзінаццаці. Скажу прама, што нават у самай адстаючай пачатковай школе цяжка ўявіць сабе такія парадкі.

Хто даў права гэтым «ваякам» і блукаючым гультаям перашкаджаць рабоце, транжырыць час свой і сваіх таварышаў, зрываць лекцыі? Вядома, ніхто ім на гэта права не даваў. Віной гэтаму—адсутнасць у такіх людзей элементарнай працоўнай дысцыпліны, культурнасці, якую яны павінны даўно-б ужо мець—бо гэта-ж студэнты!

Я прывёў у якасці прыкладаў толькі некаторыя факты і з'явы. Яны ў нас перад вачыма. На вялікі жаль, такіх фактаў значна больш. Калі прасачыць паводзіны студэнтаў у інтэрнатах, у грамадскіх месцах, на вуліцы, то можна будзе прывесці яшчэ цэлы рад прыкладаў бескультур'я і амаральных учынкаў студэнтаў.

Некаторыя добрадушныя людзі могуць сказаць, што ўсё гэта «дробязі». Я-ж думаю, што гэта не «дробязі», а рэчы вельмі сур'ёзныя. Такія «дробязі» вядуць прамой дарогай да хуліганства.

Нашы студэнты—гэта будучыя работнікі культуры, якія панясуць яе разам з ведамі ў шырокія народныя масы. А якую культуру яны могуць прынесці для другіх людзей, калі самі з'яўляюцца некультурнымі? І хоць гутарка ідзе не пра асноўную масу студэнтаў, а пра адзінкі з іх, усёроўна ад гэтых «дробязей» адмахвацца нельга. Усе мы: і выкладчыкі, і грамадскія арганізацыі, і асабліва студэнцкая маса—павінны павесці рашучую барацьбу з бескультур'ем у студэнцкім асяроддзі. Трэба, каб студэнты, выходзячы са сцен нашай навучальнай установы, не толькі не плямілі яе добрае імя, але рабілі ёй славу і чэсць—і перш за ўсё сваёй культурнасцю.

Ф. АСІПЕНКА,
прафесар

НА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАХ

Арганізавана праходзяць семінарскія заняткі ў студэнтаў 9-ай групы II курса юрыдычнага факультэта. У групе добрая дысцыпліна і наведванне, сур'ёзная падрыхтоўка да заняткаў.

Асабліва цікава праходзяць семінары па крымінальнаму праву, якімі кіруе выкладчык Матусевіч.

На апошніх занятках на пытанне «Паняцце намеру выкрадання сацыялістычнай уласнасці» змястоўныя адказы далі студэнты М. Катлярова, А. Касневіч, М. Паўлюк.

Актыўны ўдзел прымаюць студэнты і ў рашэнні складаных задач па крымінальнаму праву.

Н. ЗЕНЧАНКА.

РАБОЧЫ ДЗЕНЬ НОНЫ АНІСІМАВАЙ

Ружавее ўсход. Раніцні марозны вецер прыемна шчыпле твар. Над горадам плыве блакітны дым, пераазваньваюцца трамваі.

Нона спяшаецца ва універсітэт; хутка восем, трэба паспець на заняткі.

У аўдыторыі цішыня. Студэнты III курса аддзялення біялогіі ўважліва слухаюць лекцыю па палітэканоміі. Сярод іх і Нона Анісімава. Яна стараецца запісаць кожную думку выкладчыка. Канспекты ёй не толькі дапамагаюць рыхтавацца да экзаменаў, але і служаць добрай праграмай для самастойных заняткаў. (Мал. унізе злева).

У час перапынку Нона таксама не сядзіць без справы: нехта не здаў прафсаюзныя ўзносы —трэба прыняць, нехта жадае высветліць, як атрымаць матэрыяльную дапамогу, з сакратаром курсавога бюро неабходна вырашыць пытанне наконт наступнага мерапрыемства на курсе.

Пасля апошняга званка Нона ідзе ў бібліятэку, каб выбраць кнігу. Яна любіць літаратуру і пры ўсёй сваёй загружанасці знаходзіць час для яе чытання. Многа кніг запісана ў абанементнай картцы студэнткі. Сярод іх „Выбраныя творы" А. Барбюса, „Бура" і „Да новага берага" В. Лаціса, „Жан Крыстоф" Р. Раллана, „Вернасць" Лакатковa і многія іншыя. (Мал. уверсе справа).



У напружаныя дні перад сесіяй, якая ў гэтым годзе на III курсе пачынаецца 15 красавіка, для адпачынку застаецца вельмі мала часу. Таму ў пятай гадзіне Нона спяшаецца ў бібліятэку імя В. І. Леніна. Сёння ёй не давядзецца тут займацца да 10 гадзін, як гэта бывае заўсёды. У сем гадзін неабходна ісці ва універсітэт на пасяджэнне гуртка энтамалогіі, старастай якога яна з'яўляецца. Нона чытае свой рэферацыўны даклад „Маркіроўка мух і камароў радыёактыўным фосфарам". Гэта яе другі даклад у гэтым годзе. У першым семестры яна зрабіла даклад „Аб шкодніках канюшыны", які меў эксперыментальны характар. (Мал. уверсе злева).

—Я не ўяўляю сабе, як студэнт можа вучыцца, не займаючыся ў навукова-даследчым гуртку,—часта гаворыць Нона.—У гуртках бяруць свой пачатак курсавыя і дыпломныя работы. Я адчуваю, што гурток мне прыносіць шмат карысці. (Мал. унізе злева).

Вечар. За вокнамі аўтобуса мільгацяць агні горада. Нона думае аб прайшоўшым дні і абмяркоўвае план на заўтра: трэба схадзіць у тэатр ці кіно.

Так прайшоў адзін дзень студэнткі Ноны Анісімавай.

Е. ЛЕОНЦЬЕЎ.
Фота Л. БОНДАРА

Сістэматычна праводзіць выхаваўчую работу

Адной з форм палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў фізіка-матэматычнага факультэта з'яўляецца правядзенне гутарак у групах, дзе выкладчыкі або студэнты робяць невялікія даклады з іх наступным абмеркаваннем.

На працягу першых тыдняў гэтага семестра студэнты абмеркавалі вынікі сесіі Вярхоўнага Совета СССР, пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі нашай краіны. Акрамя гэтага, былі абмеркаваны вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі, ускрыты недахопы ў арганізацыі вучэбнай і выхаваўчай работы на факультэце і намечаны практычныя меры для іх ухілення.

Выкладчыкі ўдзельнічаюць у правядзенні гутарак, сходаў у замацаваных за імі групах, кіруюць ідэйнай мэтанакіраванасцю праводзімых мерапрыемстваў, дапамагаюць у выбары тэматыкі для гутарак, у рашэнні спрэчных пытанняў, у справе арганізацыі работы для ўхілення недахопаў у вучобе і г. д. Выкладчыкі тт. Некрашэвіч, Турэцкі, Мажуль і другія ўдзяляюць сур'ёзную ўвагу правядзенню палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

Акрамя гутарак, у групах арганізуюцца даклады аб дасягненнях айчыннай навукі, аб філасофскіх праблемах прыродазнаўства, аб барацьбе з рэлігійнымі забабонамі.

Недахопам выхаваўчай работы з'яўляецца некаторая несістэматычнасць у правядзенні тых або іншых мерапрыемстваў, не заўсёды канкрэтнае кіраўніцтва палітыка-выхаваўчай работай з боку партыйнага бюро факультэта, безініцыятыўнасць комсамольскага актыву, слабы ўдзел ў рабоце некаторых выкладчыкаў (тт. Мацко, Мурашка, Рэзнікаў, Маханёк, Міхайлаў).

Дрэнна абетаяць справы з палітыка-выхаваўчай работай на III курсе, у групе электрафізікаў IV курса аддзялення фізікі, на IV курсе аддзялення матэматыкі, на V курсах.

Неабходна тэрмінова прыняць самыя дзейсныя меры з боку партыйнага бюро для наладжвання сістэматычнай палітыка-выхаваўчай работы на фізіка-матэматычным факультэце.

І. ПЯТРОЎСКІ,
выкладчык.

ЖЫЦЦЁВЫЯ ПРЫГОДЫ ШЧАРБАКОВА

Вельмі балела галава—здавалася, вось-вось лопне. Пахмяліцца-б, ды нельга, яшчэ ўчарашняе не выпарылася, а ўрачы—народ строгі, прыдзірлівы... Генадзі нецярпліва паправіў галаўную павязку і паглядзеў на шыльду: «Цэнтральная паліклініка»... «Ну, што-ж, зойдзем...»

У прыёмным пакоі перавязачнага кабінета сядзела некалькі чалавек. Генадзі спыніўся, пахмура глянуў:

— Тут... перавязачная?

І, не чакаючы адказу, хутка прайшоў у кабінет.

Пажылы чалавек у белым халаце запытальна ўстаў насустрач.

— Вы, таварыш, да мяне? Але я яшчэ заняты...

— Я хворы, прышоў на перавязку,—голас скрыпеў рэзка і непрыемна, як нямазанае кола.—Вось і перавязвайце. Нечага!

— Ну, добра. А нумарок ваш?

— Няма.

Урач Макееў вышаў з-за стала, падышоў да хворага. Зашмальцаваная павязка на галаве Генадзія адразу прыцягнула яго ўвагу.

— Скажыце, галубок,— ветліва пачаў урач са звычайнага пытання,— што з вамі, пры якіх абставінах здарылася раненне?

Трэба было чакаць: Генадзі Шчарбакоў таксама ветліва растлумачыць усё па парадку. Але здарылася нечаканае. Вочы Генадзія раптам наліліся свінцом, рот перакасіўся ў дзікай ухмылцы.

— А табе, уласна, якая справа?—прашыпеў ён, злосна нахіляючы твар да ўрача.

— Як-жа,—збянтэжыўся ўрач,— трэба... Прынясіце тады з рэгістратуры гісторыю вашай хваробы...

— Што? Слугу знайшлі? Я хворы, прышоў на перавязку, а вы— без справы тут тарчыцё, бюракр-р-раты!

— Як вы можаце, малады чалавек...

— Нягоднік!

Хірург Макееў цяжка адышоў ад стала, адвярнуўся да сцяны — каб не бачылі студэнты-практыканты медыцынскага інстытута... Яму было соромна, горка і вельмі крыўдна: за 27 год практыкі ў яго быў першы такі пацыент.

Гэта—нядаўняя жыццёвая прыгода Генадзія Шчарбакова, студэнта IV курса юрыдычнага факультэта. Даравітая натура героя прыгод яшчэ задоўга да гэтага нястомна ўшісвала ў асабовую справу студэнта не менш яркія старонкі.

1951 год. Першы курс. Пабоішча са студэнтамі політэхнічнага інстытута. Генадзі Шчарбакоў атрымоўвае баявое хрышчэнне: яго пырнулі нажом. Дырэкцыя інстытута аб'яўляе Шчарбакову вымову.

1952 год. Вакзальны рэстаран. Генадзі і яго сябра Фелікс Каштанаў (V курс філасофскага аддзялення універсітэта) ушчэнт напіваюцца. Багатая фантазія падказвае ім новы трук, і «верныя сябры», выкарыстаўшы адсутнасць афіцыянткі, крадуць дзве бутэлькі віна з апельсінчыкам. Афіцыянтка прыходзіць з міліцыянерам, патрабуе ўплаціць за віно. Шчарбакова гэта абурае, і ў «гневе вялікім» збівае ні ў чым невінаватую афіцыянтку і міліцыянера.

1952 год. Майскі дзень. Парк імя Горкага. Цёплае вясновае паветра п'яніць і без таго ўжо п'яных Генадзія Шчарбакова і яго сябра. Яны раз-по-раз абражаюць гуляючых. Але гэтага ім здаецца мала. Сябры накіроўваюцца на прадстаўленне цырка. Тут і разыгрываецца сапраўдная баталія—Генадзі і Рэм уступаюць у адзінаборства з супрацоўнікамі цырка. Але цыркачы іх хутка ўціхамірваюць і адводзяць у першае аддзяленне міліцыі. У выніку—Генадзію Шчарбакову ў інстытуце выносяць вымову з апошнім папярэджаннем.

І вось зноў вясна 1953 года. Рэстаран «Зара». Ваяўнічасць Генадзія, нягледзячы на ўсё, узрастае. Моцным ударам ён звальвае з ног падпалкоўніка авіяцыйнай службы, разбівае яму твар. Як звычайна, Генадзія Шчарбакова затрымліваюць і дастаўляюць у трэцяе аддзяленне міліцыі.

На імя дырэкцыі Мінскага юрыдычнага інстытута прыходзіць чарговае пісьмо з органаў міліцыі. Наступае чорная паласа жыццёапісання Генадзія—яго выключаюць з інстытута. Але лёс зменліў. Блізкія і знаёмыя яго маці хадайнічаюць і дабіваюцца ў дырэкцыі ўзнаўлення Генадзія студэнтам III курса.

З таго часу на курсе і ў дэканаце вырашылі: цяпер вось Генадзі задумаецца над сваім далейшым жыццём, перавыхавае сябе. Прайшло каля двух год. Час для выпраўлення—больш чым патрэбны. Але Генадзі вёў сябе па-ранейшаму—з таварышамі быў ганарлівы, у вучобе вялікіх поспехаў не паказваў. За несвоечасовае прыбыццё на вытворчую практыку і прагул у сувязі з гэтым чацвертакурснік Генадзію Шчарбакову аб'яўляецца строгая вымова.

Але «спартыўнае зазнайства» і цяга да спіртнога, як кажуць аднакурснікі аб Генадзію, не давала яму спакою. І вось зноў чарговы дэбош у паліклініцы...

Днямі ў камітэце комсамола універсітэта адбылося абмеркаванне асабовай справы комсамольца Генадзія Шчарбакова. Члены камітэта задалі нямала пытанняў «абвінавачваемаму» і атрымалі не менш падрабязныя адказы. Так, на пытанне, чаму Генадзі п'янствуе, ён жалобна адказаў: «Пакутваў за хворую маці»... Гэта, з дазволу сказаць, сыноўняя любоў і іншыя слязлівыя заяўленні Генадзія былі ўспрыняты членамі камітэта, як глыбокае раскайванне. Прагаласавалі... за строгую вымову з занясеннем у асабовую справу (які ўжо раз!).

Ці не занадта ліберальнае рашэнне?

Е. КОРШУКАЎ.

Прыцягваць новых укладчыкаў

Асноўнай крыніцай даходаў Дзяржаўнага бюджэта СССР з'яўляюцца накапленні ад соцыялістычнай гаспадаркі. Рост соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, развіццё транспарту, пашырэнне таваразвароту, уздым прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі і павышэнне рэнтабельнасці прадпрыемстваў—усё гэта стварае ўмовы для сістэматычнага павелічэння дзяржаўных даходаў.

Адной з дадатковых крыніц фінансавання гаспадарчага і культурнага будаўніцтва з'яўляюцца сродкі, якія паступаюць ад насельніцтва ў добраахвотным парадку па Дзяржаўных пазыках і ў выглядзе ўкладаў у ашчадныя касы. Рост зарплаты рабочых і служачых, павышэнне даходаў калгаснікаў, паслядоўнае зніжэнне цэн на тавары народнага спажывання ствараюць у нас трывалую аснову для паляпшэння матэрыяльнага добрабыту насельніцтва, росту зберажэнняў працоўных і для павелічэння ўкладаў у ашчадныя касы.

Захоўваючы свае сродкі ў ашчаднай касе, укладчыкі атрымоўваюць па ўкладу пэўны даход у выглядзе працэнтаў або выйгрышаў.

Такім чынам, кожны ўкладчык, з аднаго боку, дае магчымасць совецкай дзяржаве часова выкарыстаць свае сродкі на фінансаванне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, а з другога боку—атрымоўвае рад асабістых выгад.

На першае студзеня 1955 года па універсітэту налічвалася ўкладчыкаў 255 чалавек з агульнай сумай уклада 800 тысяч рублёў. На працягу першага квартала 1955 года прыбавілася ўсяго толькі 12 укладчыкаў.

Як бачна з вышэй прыведзеных дадзеных, колькасць укладчыкаў па універсітэту ўзрасла нязначна. З агульнага ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу ўкладчыкамі ва універсітэцкай ашчаднай касе састаіць нямногім больш палавіны.

Ашчадная каса універсітэта выгадная і зручная. Яна можа па заяве ўкладчыка залічыць усю зарплату на асабісты рахунак і выдаваць па першаму запатрабаванню ўкладчыка любую суму ўклада. Акрамя таго, па ашчаднай кніжцы нашай касы грошы можна атрымаць у цэнтральнай ашчаднай касе № 16 Ленінскага раёна ў гадзіны і дні, калі каса універсітэта не працуе.

Прыцягненне новых укладчыкаў справа вялікай дзяржаўнай важнасці, бо часова перадаваемыя [illegible] ражэнні працоўных дзяржава [illegible] нічаюць развіццю народ[illegible] даркі СССР. Гэта работа [illegible] стаць у цэнтры ўвагі грама[illegible] універсітэта.

П. КРАЎЦОЎ,
камсод універсітэта.

Актыўная група

На юрыдычным факультэце шостая група I курса з'яўляецца прыкладам у вучобе, дысцыпліне і грамадскай рабоце. Ажыўлена праходзяць тут семінарскія заняткі па курсу асноў марксізма-ленінізма (кіраўнік дацэнт Рагожын). Нядаўна першакурснікі вывучалі тэму «Тэорыя і праграма Комуністычнай партыі па нацыянальнаму пытанню». Для адказа на адно з пытанняў гэтай тэмы студэнт Л. Дробышэўскі выкарыстаў абшырны дадатковы матэрыял, прывёў удалыя прыклады з жыцця.

За адказам Л. Дробышэўскага паследавалі змястоўныя адказы студэнтаў А. Хралова, Л. Юркова, Н. Серафімовіча, М. Лісавенка і другіх.

С. СЕРОВА.

ВЫНІКІ ЛЫЖНАГА ПЕРШЫНСТВА

Закончылася першынство універсітэта па лыжнаму спорту. У адрозненне ад мінулых год спаборніцтвы характарызаваліся выдатнай тэхнічнай падрыхтоўкай удзельнікаў, чоткай работай судзейскай калегіі і добрай агульнай арганізацыяй спаборніцтваў.

Спаборніцтвы пачаліся гонкай жанчын на 5 км. Лепш за ўсіх на гэтай дыстанцыі выступіла студэнтка фізіка-матэматычнага факультэта Холкіна, якая паказала выдатны вынік —21 мінуту 13 секунд, выканаўшы норму першага спартыўнага разраду. На другім месцы аказалася прадстаўніца гэтага-ж факультэта Тапарык—24 мінуты 12 секунд.

Выдатных поспехаў дабіліся жанчыны на васьмікіламетровай дыстанцыі. Мацнейшай аказалася прадстаўніца каманды гістарычнага факультэта Кар'янава. Яе вынік—35 мінут 03 секунды. Другое і трэцяе месцы падзялілі студэнткі хімічнага факультэта Марук і Ліннік, паказаўшыя адпаведна 36 мінут 05 секунд і 36 мінут 15 секунд. Усе тры спартсменкі выканалі нормы першага спартыўнага разраду.

Вострая барацьба разгарэлася ў мужчын на дыстанцыі ў 10 кіламетраў. Першым фінішыраваў студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Казей, які паказаў час—42 мінуты 25 секунд. Гэты вынік заставаўся лепшым, пакуль лінію фініша не перасек прадстаўнік каманды фізмата Іўко. Яго час—40 мінут 50 секунд—лепшы вынік дня.

На пятнаццацікіламетровай дыстанцыі мацнейшым быў студэнт юрыдычнага факультэта Зарубіцкі. Ён закончыў дыстанцыю з часам 1 гадзіна 13 мінут 29 секунд.

У выніку напружанай барацьбы ў камандным заліку на першае месца выйшла каманда хімічнага факультэта.

І. ДАБРАЛЮБАЎ.

СТАРОНКА З ДЗЁННІКА ГУЛЬТАЯ

Зробім адразу агаворку: студэнт III курса гістарычнага факультэта Яўгені Вашкевіч не вядзе ніякага дзённіка. На гэта ён занадта лянівы. Але калі-б яму прышла ў галаву думка сёе-тое запісваць, а запісанае суправаджаць малюнкамі са свайго жыцця, то на адной са старонак красавалася-б наступнае:

«21 сакавіка. Устаў недзе каля адзінаццаці. Усе з нашага пакоя пайшлі працаваць. Вось эгаісты! Ну, вядома, ім лягчэй, яны не блукалі ўчора па калідорах да двух гадзіны ночы. Трэба-ж было прыгледзець, хто каго праводзіць дамоў, хто з кім любуецца.

Вось і прайшла нядзеля, вось і зноў пачаўся шэры вучэбны тыдзень. А тут яшчэ за акном імжыць ні то дождж, ні то снег. І гэта называецца вясна, пара кахання, як сказаў, здаецца, Хачатуран?! Няма ніякага натхнення брацца за кнігу. Ды і навошта брацца? Да сесіі далёка. Вучы не вучы, а гэтыя выкладчыкі зноў паставяць мне двойку. Я іх ведаю!



Трыццаць хвілін прастаяў каля лесвічнага акна. Спачатку вывучаў прывакзальную плошчу, потым уласныя туфлі. Нічога асаблівага. Хіба толькі, што нейкая жанчына перакулілася на лёдзе. Ад суму пазяхнуў некалькі разоў і адправіўся абедаць. Вось толькі цяпер я зразумеў, што значыць стыпендыя. Былі-б грошы, падмацаваўся-б сто грамамі чыстай, як гэта часценька бывала раней... А так?! Хіба бацькі зразумеюць маю «самую здольную», як кажа наша Эла Хуцкая, паэтычную натуру.

На лекцыях, як заўсёды, сумна. Хуцкая не хоча ўжо пагаварыць са мною; сёння яна ўсе лекцыі сакатала са сваёй новай ахвярай—Лёняй Уваравым. Ну і няхай! Што я ёй, што яна мне, як сказаў, здаецца, пушкінскі Гамлет! Махнуўшы рукой на Элу, узяўся за раманчык. Але дачытаць яго не давялося. За парушэнне дысцыпліны выкладчыца польскай мовы В. М. Цімафеева папрасіла мяне з аўдыторыі. Ну і няхай! А мне што?



Вечарам на комсамольскім бюро мяне старанна прапясочылі. Успомнілі і «тройку» па замежнай мове, і «двойку» па гісторыі БССР, і пропускі, і паводзіны. Толькі мяне голымі рукамі не возьмеш. Сказаў ім, што не маю часу, бо кожную нядзелю еду дамоў за харчамі, пусціў пыл аб сваёй дзейнасці на пасту старшыні рэвізійнай камісіі ДТСААФ. Крыху для выгляду пакаяўся—і адпусцілі. Вярнуўся ў інтэрнат— і на бакавую. Прайшоў яшчэ адзін дзень. Гавораць, што бескарысна, бязмэтна? Ну і няхай!»

У. АЛЕГАЎ.

14 красавіка
адбудзецца
агульнаўніверсітэцкая канферэнцыя
чытачоў газеты
„За сталінскія кадры".
Рыхтуйцеся да канферэнцыі!

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 01255 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 1000 экз. Зак. 193